Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка"

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэмах

**"МА Р Ф Е М І К А". "С Л О В А ЎТ В А Р ЭН Н Е"**

па дысцыпліне "Беларуская мова"
для спецыяльнасці:
1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск

2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ

**I. Тэарэтычны раздзел**

**1. Марфеміка**

1.1. Марфеміка як вучэнне аб марфемах
1.2. Адметныя адзнакі марфемы
1.3. Тыпы марфем
1.4. Варыянтнасць марфем
1.5. Аснова слова і яе тыпы
1.6. Канчатак
1.7. Корань слова, тыпы кораня
1.8. Афіксы. Словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы
1.9. Постфікс
1.10. Інтэрфікс

**2. Словаўтварэнне**
2.1. Словаўтварэнне, яго прадмет і задачы
2.2. Утваральная аснова і словаўтваральны фармант
2.3. Словаўтваральны ланцужок, словаўтваральнае гняздо
2.4. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове (марфемны і немарфемны)
2.5. Тыповы памылкі ў вусным маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту і шляхі іх выпраўлення

**3. Пытанні да самакантролю ведаў**

**4. Практычнаыя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Марфеміка

### 1.1. Марфеміка як вучэнне аб марфемах

***Марфеміка*** -- галіна мовазнаўства, якая вывучае марфемы як часткі слова, структуру і тыпы марфемаў, заканамернасці іх спалучэння і

функцыянавання ў мове. Таксама ***марфемікай*** называюць марфемны лад пэўнай мовы (*марфеміка беларускай мовы*, *марфеміка рускай мовы*), спалучэнне вылучаных у словах марфемаў і іх тыпы. У марфеміцы разглядаюцца разнастайныя віды марфем паводле іх месца ў слове, функцыі, віды афіксаў, а таксама тыпы значэнняў, якія выражаюцца марфемамі.

### 1.2. Адметныя адзнакі марфемы

У складзе слова выдзяляюцца часткі, або марфемы. ***Марфемы*** (грэч. *morphe* – форма) – найменшая частка слова з пэўным значэннем. Так, у слове *сіненькі* тры марфемы: *сін-*, *-еньк-*, -і-. Марфема *сін-* выражае асноўнае значэнне прыметы (колеру); *-еньк-* -- мае памяншальна-ласкальнае значэнне; *-і* – граматычныя значэнні адзіночнага ліку, мужчынскага роду, назоўнага склону. Гэтыя часткі нельга падзяліць на больш дробныя, якія б мелі значэнне; менавіта наяўнасцю лексічнага або граматычнага значэння марфемы адрозніваюцца ад гукаў і складоў, якія таксама выдзяляюцца ў слове.

### 1.3. Тыпы марфем

Да марфем адносяцца корань і афіксы: прыстаўка (прэфікс), суфікс, канчатак (флексія), постфікс, інтэрфікс (злучальны афікс). Марфемы бываюць ***абавязковымі*** і ***неабавязковымі.*** Корань – абавязковая марфема, без якой не можа быць слова; афіксы – неабавязковыя марфемы, якія ёсць у адных словах, а ў другіх іх можа і не быць.

Марфемы падзяляюцца на свабодныя і звязаныя. ***Свабоднымі*** лічацца марфемы, якія могуць супадаць з асновай хоць бы ў адным паўназначным слове, ***звязанымі*** – марфемы, якія ўжываюцца толькі ў спалучэнні з іншымі марфемамі асновы. Каранёвыя марфемы бываюць свабоднымі і звязанымі, афіксальныя – толькі звязанымі.

### 1.4. Варыянтнасць марфем

Гукавы склад марфем можа мяняцца ў выніку пазіцыйных або гістарычных чаргаванняў: *вада, воды, вадзяністы*; *сон, сну; дні, дзень*. Відазмяненні марфемы, якія назіраюцца ў формах аднаго слова або ў роднасных словах, называюцца ***варыянтамі марфемы*** або ***морфамі***. Да адной і той жа марфемы адносяцца варыянты, якія маюць аднолькавае значэнне і блізкі гукавы склад. Так, у словах *сады, у садзе, саджанец* каранёвая марфема прадстаўлена трыма варыянтамі: *сад-, садз-, садж-*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1.5. Аснова слова і яе тыпы

***Аснова*** - частка формы слова без канчатка, формаўтваральных суфіксаў інфінітыва *–ць, -ці, -чы* і постфікса *-це* (у форме 2-ой асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу), якая выражае лексічнае значэнне слова: *дрэв-а, зялён-ы, зарэчн-ы, насі-ць, нес-ці, бег-чы, насі-це.* Асновы бываюць простыя і складаныя. ***Простыя*** асновы маюць адну каранёвую марфему, а ***складаныя*** – дзве і больш, параўн.: *азёрн-ы* і *часопісн-ы.*

Простыя асновы падзяляюцца на ***невытворныя*** і ***вытворныя***. Невытворная – гэта аснова, якая складаецца толькі з адной марфемы – кораня: *трав-а, чорн-ы, няс-у.* Невытворная аснова супадае з коранем, а ў вытворнай, акрамя кораня, ёсць афіксы.

Лексічнае значэнне невытворнай асновы выражаецца коранем: *зім-а* "самая халодная пара года паміж восенню і вясной". Значэнне вытворнай асновы часцей складаецца з сумы значэнняў асобных марфем – кораня і афіксаў, якія ўваходзяць у яе, і тлумачыцца праз сувязь з невытворнай асновай: *зімов-ы* "які бывае зімой, звязаны з зімой". Вытворныя асновы суадносяцца з адпаведнымі невытворным: *лес* і *лясн-ы,бераг – прыбярэжны.*

Невытворныя і вытворныя асновы служаць базай для ўтварэння новых слоў. Аснова, ад якой утворана аснова слоў, называецца ***ўтваральнай***. Так, утваральная аснова слоў *марскі, прыморскі* з'яўляецца невытворнай (*мор-*), а ўтваральныя асновы слоў *выкладчык, перапісчык* -- вытворныя (*выклад-аць, перапіс-аць*).

Формы некаторых слоў могуць утварацца ад розных асноў, якія называюцца ***суплетыўнымі*** (фр. *suppletif* – дадатковы). Ад суплетыўных асноў утвараюцца формы ступеней параўнання некаторых якасных прыметнікаў і прыслоўяў: *добры – лепшы, дрэнны – горшы*; *добра – лепш, дрэнны – горш*; склонавыя формы займеннікаў: *я – мяне, мне, мною; мы – нас, нам, намі;* формы трывання некаторых дзеясловаў: браць – *узяць; класціся – легчы.*

## 1.6. Канчатак

***Канчатак,*** або ***флексія*** ( лац. *flexio* – згінанне, выгін), -- зменная службовая марфема, якая ўтварае граматычныя формы слова і служыць для сувязі яго з іншымі словамі ў сказе, напрыклад*: зямл-я, зямл-і, зямл-і, зямл-ю, зямл-ёй (-ёю), (на) зямл-і* – канчаткі ўтвараюць склонавыя формы назоўніка. А ў сказе *Продкі ані мае, ані твае сваёй зямлі не мянялі*. (Р.Б.) канчатак *–і* ў слове *зямлі* паказвае на родны склон і на сувязь гэтага слова з дзеясловам (*не)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*мянялі.* Канчаткі выражаюць граматычныя значэнні роду (*брат, сястра,дзіця*), ліку (*высокі дуб, высокія дубы*), склону (*высокі дуб, на высокім дубе*), асобы (*іду,ідзеш, ідзе*). Звычайна канчаткі маюць некалькі граматычных значэнняў. Так, у слове *нізк-і* канчатак мае граматычныя значэнні роду, ліку, склону, а ў слове *бач-у* – ліку і асобы. Пры змяненні канчаткаў змяняецца граматычная форма і граматычнае значэнне слова, а лексічнае значэнне застаецца нязменным.

Паколькі канчатак – формаўтваральная марфемы, вылучаюцца канчаткі параўнаннем розных форм аднаго слова: *сасн-а, сасн-ы, сасн-е.* Яны знаходзяцца ў канцы формы слова: пасля канчаткаў бываюць толькі постфіксы: *піш-уц-ца, пісал-а-ся, піш-ы-це.*

Канчаткі могуць складацца з аднаго або больш гукаў *чыст-ы, чыст-ым, чыст-ага*. Аднак ёсць словы, у якіх канчаткі не маюць гукавога выражэння (матэрыяльна не выражаныя); такія канчаткі называюцца ***нулявымі.*** Нулявы канчатак з'яўляецца, напрыклад, паказчыкам назоўнага склону (а для неадушаўлённых – і вінавальнага) адзіночнага ліку мужчынскага роду назоўнікаў другога скланення: *луг, верас*; назоўна-вінавальнага склону адзіночнага ліку жаночага роду назоўнікаў трэцяга скланення (*завязь, гусь, плынь*); мужчынскага роду дзеясловаў прошлага часу: *забег, прынёс*.

Кожнаму зменнаму слову ўласцівы свае канчаткі, па якіх адрозніваюцца назоўнікі першага, другога і трэцяга скланення, дзеясловы I і II спражэнняў і інш.

### 1.7. Корань слова, тыпы кораня

Вытворныя і невытворныя асновы адрозніваюцца марфемнай будовай: у невытворнай аснове выдзяляецца толькі корань, у вытворнай – корань і афіксы.

***Корань*** – гэта абавязковая марфемы, якая выражае агульнае лексічнае значэнне родных (аднакарэнных) слоў: *балот-а, балот-н-ы, балот-ц-а, балот-іст-ы.* Корань *балот (балоц-)* з'яўляецца агульным для ўсіх роднасных слоў і паказвае на іх сувязь з паняццем "балота". Існуюць словы без канчаткаў (*метро, тут*), без прыставак (*дзян-ёк, воль-н-ы*), без суфіксаў (*пад-групы, по-шум*), але слоў без кранёў няма. Калі аснова складаецца з адной марфемы, то гэтая марфема – корань: *стол, парт-а, чырвон-ы, шмат.*

Карані бываюць свабодныя і звязаныя. ***Свабодныя*** – гэта такія карані, якія супадаюць з асновай хоць бы ў адной форме слова. Так, у словах *снег,снег-ав-ы, снеж-н-ы* корань свабодны, паколькі ў слове *снег* супадае з

асновай. Свабодныя карані могуць ужывацца ў мове ізалявана (*кафэ, таксі, міні*) і ў спалучэнні з канчаткамі (*рук-а, жоўт-ы, бяр-у*) і іншымі афіксамі (*руч-н-ы, жаўт-ок, пад-бяр-у*). **Звязаныя** карані ніколі не супадаюць з асновай, сустракаюцца заўсёды толькі ў вытворнай аснове ў спалучэнні з афіксамі: *аб-вык-а-ц-ца, з-вык-ну-ц-ца, з-выч-к-а,пры-вык-а-ць*; *вул-іц-а, вул-ачк-а, за-вул-ак, вул-іч-н-ы*. Вылучаюцца карані падборам роднасных слоў: *народ, народ-н-ы, народ-н-асць; аб-у-ць, аб-у-т-ак, аб-у-т-к-ов-ы, аб-у-т-нік.*

## 1.8. Афіксы. Словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы

***Афіксы*** (лац. *affixus* — прымацаваны) — гэты службовыя марфемы, якія з'яўляюцца неабавязковымі для кожнага слова і служаць для ўтварэння новых слоў ці новых граматычных формаў: *чытаць – пера-чытаць, чысты – чысц-ін-я, чысты – чысц-ейш-ы, най-чысц-ейш-ы.* У адрозненне ад кораня афіксы бываюць толькі звязаныя: яны ніколі не супадаюць з асновай і ўжываюцца толькі ў складзе вытворнай асновы ў спалучэнні з іншымі марфемамі. Да афіксаў адносяцца прыстаўкі, суфіксы, інтэрфіксы, постфіксы.

***Прыстаўка***, або ***прэфікс*** (лац. *ргае* < *ргае* — спераду, *fixus* — прымацаваны), — афікс, які знаходзіцца ў складзе простай асновы перад коранем і надае слову новае лексічнае або граматычнае значэнне: *вы-ехаць, ня-смелы, пра-ўнук, па-на-ехаць.* Прыстаўка можа знаходзіцца не непасрэдна перад коранем, а перад другой прыстаўкай (дзве прыстаўкі ў слове): *па-за-пісваць, па-на-сыпаць, па-пры-носіць, па-за-вяз-ваць.*

***Суфікс*** (лац. suffixus — падстаўлены) — частка асновы, якая стаіць пасля кораня і ўтварае новую форму або новае слова*: пал-яв-ы, пчал-яр, бар-ав-ін-а.* Суфікс можа быць не толькі непасрэдна пасля кораня, а і пасля іншага суфікса*: гад-ав-ін-а, за-гарт-оў-к-а, сард-эч-н-ы.*

Паводле ролі ў слове адрозніваюцца словаўтваральныя і формаўтваральныя прыстаўкі і суфіксы. ***Словаўтваральныя*** прыстаўкі і суфіксы ўтвараюць словы з новым лексічным значэннем: *горад -- гарад-ск-і, дзядуля – дзядул-еў, клас – пад-клас.*

***Формаўтваральныя*** прыстаўкі і суфіксы служаць для ўтварэння новай формы слова, якая захоўвае тоеснасць лексічнага значэння: *нізкі—ніж-эйш-ы, най-ніж-эйш-ы, спяваць – спява-ў, спява-л-а*. Прыстаўкі і суфіксы выкарыстоўваюцца пераважна як словаўтваральныя афіксы.

Формаўтваральнымі з'яўляюцца суфіксы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў *-ейш-, -эйш-, -ш-*: *смялейшы мудрэйшы, старшы*; вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў *-ей, -эй, -ш: цяплей, вышэй, лепш*;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

еуб'ектыўнай ацэнкі: *маленькі, песенька, матулька, сыночак*; прошлага часу дзеясловаў: *сказаў, прынесла, спалі*; трыванняў дзеясловаў: *звязваць, запісваць* і інш.

### 1.9. Постфікс

***Постфікс*** (лац. post— пасля, fixus — прымацаваны) — афікс, які знаходзіцца ў слове пасля канчатка ці формаўтваральнага суфікса. У беларускай мове постфіксамі з'яўляюцца ***-ся (-ца, -цца)*** у формах зваротных дзеясловаў: *глядзеў – глядзеў-ся, сустрэла — сустрэла-ся, сустрэць — сустрэц-ца, мыеш — мыеш-ся, мые — мые-цца, мыц-ца*; ***-це*** ў форме 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу: *пішы-це, касі-це;* ***-сьці(-сь), -небудзь*** у няпэўных займенніках*: хтосьці, штосьці, які-небудзь*.

У сучаснай беларускай мове постфіксы *-ся(-ца, -цца), -це, -сьці(-сь), -небудзь* не ўжываюцца свабодна ў сказе і не аддзяляюцца іншым словам ад слова, да якога адносяцца. Іх ужыванне немагчыма па-за словам. Гэтыя былыя часціцы поўнасцю перайшлі ў марфемы, захаваўшы асаблівасць размяшчацца пасля канчатка.

Постфіксы бываюць словаўтваральныя і формаўтваральныя. Напрыклад, постфіксы *-сьці(-сь), -небудзь* з'яўляюцца словаўтваральнымі: з іх дапамогай утвараюцца новыя словы — няпэўныя займеннікі і прыслоўі: *штосьці, што-небудзь, дзесь, дзе-небудзь*. Постфікс *-ся(-ца, -цца)* пераважна выкарыстоўваецца як словаўтваральны (часта разам з прыстаўкамі): *глядзець* -- *глядзецца, наглядзецца, разгледзецца*; формаўтваральнае значэнне ён мае ў дзеясловах залежнага стану: *артыкул вычытваецца студэнтам, бераг размываецца вадою*. Постфікс -*це* бывае толькі формаўтваральны: з яго дапамогай утвараецца форма 2-й асобы множнага ліку дзеясловаў загаднага ладу: *гавары — гаварыце, нясі — нясіце, глянь — гляньце*.

### 1.10. Інтэрфікс

***Інтэрфікс*** (лац. inter — паміж, fixus — прымацаваны) — гэта афікс, які ўжываецца паміж простымі дзвюма асновамі ў складаным слове: *ільн-о-валакно, горад-а-будаўніцтва, дв-ух-складовы, тр-ох-працэнтны.* Інтэрфіксы -- службовыя марфемы, яны не выражаюць ніякага значэння, а толькі служаць для сувязі марфем у складаных словах.

## 2. Словаўтварэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2.1. Словаўтварэнне, яго прадмет і задачы

***Словаўтварэнне*** – гэта раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца будова вытворных (матываваных) слоў, спосабы і сродкі іх утварэння. Тэрмінам “словаўтварэнне” называюць і сам працэс утварэння новых слоў.

Словаўтварэнне як раздзел навукі аб мове цесна звязана з лексікалогіяй і марфалогіяй, з якімі яно мае агульны аб’ект вывучэння – слова. Лексіка мовы напаўняецца ў выніку словаўтваральных працэсаў, а кожнае новае слова афармляецца па граматычных законах як пэўная часціна мовы.

Аднак у словаўтварэнні вывучаюцца толькі ***вытворныя*** (матываваныя) словы, якія ўзніклі ў працэск словаўтварэння і значэннем і гучанне якіх абумоўлена іншымі аднакарэннымі словамі (утваральнымі). Невытворныя словы ў адрозненне ад вытворных узніклі не ў працэсе словаўтварэння, а як умоўныя назвы прадметаў, прымет, дзеянняў: *дрэва, стол, белы, ісці.*

## 2.2. Утваральная аснова і словаўтваральны фармант

Вытворнае слова складаецца з утваральнай асновы і словаўтваральнага фарманта. ***Утваральная аснова*** – гэта частка ўтваральнага слова, агульная з вытворным, напрыклад: *бераг – берагавы* (утваральная аснова *бераг-*, фармант *–ав-*. Некаторыя вытворныя словы маюць больш чым адну ўтваральную аснову: *бетон мяшаць – бетонамяшалка* (утваральная аснова *бетон-, мяша-, фармант –лк-а).*

***Словаўтваральны фармант*** – гэта сродак, з дапамогай якога ўтвараюцца новыя словы.

## 2.3. Словаўтваральны ланцужок, словаўтваральнае гняздо

Вытворнае і ўтваральнае словы звязны адносінамі словаўтваральнай вытворнасці, або матывацыі. Словаўтваральная вытворнасць – гэта такія адносіны паміж двума аднакарэннымі словамі, калі значэнне аднаго можна растлумачыць праз значэнне другога. Так, значэнне вытворных слоў *выкладчык, перапісчык* можна растлумачыць праз значэнне аднакарэнных дзеясловаў, на базе якіх яны ўзніклі: *выкладаць – выкладчык* “той, хто выкладае”, *перапісваць – перапісчык* “той, хто перапісвае”.

Вытворнае слова можа стаць утваральным (матываваным) для наступнага, а наступнае – для новага і г.д.: *чытаць – перачытаць – перачытваць – перачытванне*. Аднакарэнныя словы, звязаныя адносінамі паслядоўнай вытворнасці, называюць ***словаўтваральным ланцужком***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Невытворнае слова можа быць заходным для ўтварэння некалькіх словаўтваральных ланцужкоў. Сукупнасць словаўтваральных ланцужкоў, якія маюць адно і тое ж зыходнае слова, называецца ***словаўтваральным гняздом.***

## 2.4. Асноўныя спосабы ўтварэння слоў у беларускай мове (марфемны і немарфемны)

***Словаўтваральны спосаб*** – гэта адзінка класіфікацыі ў словаўтварэнні, якая аб'ядноўвае словы з адным відам словаўтваральнага фарманта (прыстаўкай, суфіксам, постфіксам). Так, словы *лётчык, лясны, пчаляр, шахцёр, каменны, марскі* ўтвораны адным спосабам – суфіксальным, таму што пры іх утварэнні выкарыстаны словаўтваральныя суфіксы. У беларускай мове традыцыйна вылучаюць два асноўныя спосабы ўтварэння слоў – марфемны і немарфемны.

Для вытворных слоў з адной утваральнай асновай характэрны ***марфемны*** спосаб утварэння, пры якім словаўтваральным сродкам з'яўляецца афікс. У залежнасці ад таго, які афікс выкарыстоўваецца пры словаўтварэнні, унутры марфемнага спосабу адрозніваюць наступныя спосабы.

***Суфіксальны*** спосаб – гэта ўтварэнне слоў далучэннем да ўтваральнай асновы суфікса (у нязменных словах) або суфікса і канчатка: *ціхі – ціха, высокі – высока, помніць –помнік, знішчаць – знішчальнік.*

Разнавіднасцю гэтага спосабу лічыцца ***нульсуфіксальны*** спосаб. У словах, утвораных гэтым спосабам, суфікс матэрыяльна не выражаны – нулявы: *прыходзіць – прыход, скакаць – скокі, глухі – глуш.* Гэтым спосабам утвараюцца назоўнікі ад дзеясловаў і прыметнікаў, парадкавыя лічэбнікі ад колькасных: *пяць – пяты.*

***Прыставачны*** спосаб – утварэнне слоў далучэннем прыстаўкі да ўтваральнага слова: *унук – праўнук, дзе – недзе, чытаць* -- *вычытаць, перачытаць, прачытаць.*

***Постфіксальны*** спосаб – утварэнне слоў далучэннем постфікса да ўтваральнага слова. Гэтым спосабам утвараюцца дзеясловы, займеннікі і прыслоўі: *насіць – насіцца, што – штосьці, куды – куды-небудзь.*

Прыстаўкі і постфіксы, у адрозненне ад суфікса, далучаюцца да слова, а таму вытворнае слова адносіцца да той жа часціны мовы, што і ўтваральнае: *ехаць – выехаць, выпісаць – выпісацца.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Прыставачна-суфіксальны*** спосаб __ утварэнне слоў адначасовым далучэннем прыстаўкі і суфікса (матэрыяльна выражанага або нулявога): *гара – узгорак, бераг – прыбярэжны*.

***Прыставачна-постфіксальны*** спосаб – утварэнне слоў адначасовым далучэннем да ўтваральнага слова прыстаўкі і постфікса: *ляжаць – наляжацца, бегчы – разбегчыся, спаць – выспацца.*

Утварэнне новых слоў шляхам далучэння да ўтваральнай асновы або да ўтваральнага слова розных афіксаў лічыцца найбольш пашыраным у мове і мае агульную назву ***афіксацыя***.

Новыя словы могуць утварацца на базе двух або больш утваральных слоў або асноў; тады выкарыстоўваюцца такія спосабы, як складанне, суфіксальна-складаны, зрашчэнне, абрэвіяцыя.

***Складанне*** – спосаб утварэння слоў шляхам аб’яднання дзвюх ці больш асноў або цэлых слоў: *лесатундра, шкловалакно, плашч-палатка*. Для сувязі частак пры складанні ўжываецца ***інтэрфікс***, які можа быць матэрыяльна выражаным: *лес**а**стэп, нов**а**будоўля* або нулявым: *канферэнц-зала, сон-трава*.

***Суфіксальна-складаны*** спосаб – складанне ў спалучэнні з суфіксальным спосабам: *байкапісец, зернесушылка, левабярэжны*.

***Зрашчэнне*** – спосаб словаўтварэння, пры якім двы словы, звязаныя падпарадкавальнай сувяззю, аб’ядноўваюцца ў адно. У будове складанага слова гэта сувязь захоўваецца; залежнае слова з’яўляецца першай часткай: *вечназалёны, высокаадукаваны, свежамарожаны*.

***Абрэвіяцыя*** – спосаб утварэння сладана-скарочаных слоў, або абрэвіятур, шляхам аб’яднання ўсечаных частак або частак і цэлага слова: *ВНУ, БДПУ, БелСЭ, райана, медсястра, санстанцыя*.

Новыя словы могуць утварацца шляхам пераходу адной часціны мовы ў другую. Гэта ***марфолага-сінтаксічны спосаб***. Сутнасць гэтага спосабу заключаецца ў тым, што словы адной часціны мовы выконваюць сінтаксічныя функцыі, набываюць лексічнае і граматычнае значэнні, уласцівыя іншым часцінам мовы. Такім спосабам утвараюцца назоўнікі ад прыметнікаў і дзеепрыметнікаў (субстантывацыя): *рабочы, хворы, марожанае;* прыметнікі ад дзеепрыметнікаў (ад’ектывацыя): *гаючы, каханы;* прыслоўі ад формаў слоў і іншых часцін мовы (адвербіялізацыя): *памалу, дасыта, удвая*.

***Лексіка-семантычны спосаб*** – утварэнне новых слоў расшчапленнем значэнняў мнагазначнага слова. У выніку асобныя словы страчваюць сувязь паміж сабой і з’яўляюцца словы-амонімы: *гасцінец* “дарога” і *гасцінец* “падарунак”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2.5. Тыповы памылкі ў вусным маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту і шляхі іх выпраўлення

[Пры напісанні раздзела быў выкарыстаны матэрыял дапаможніка: Старжынская Н.С., Дубініна Дз.М. “Методыка развіцця роднай мовы”— 2-е выд., выпр. — Мінск: Вышэйшая школа, 2008. — 301 с.].

Малыя дзеці не адразу пачынаюць карыстацца словаўтваральнымі механізмамі. Дзеці ранняга і малодшага дошкольнага ўзросту не здольныя праводзіць аналіз вытворных слоў, а, значыць, і ствараць іх. У выпадку неабходнасці стварыць падобнае слова, малы (калі не запомніў словаформу з маўлення дарослых) проста замяняе яго, для чаго часам будуе даволі складаныя сінтаксічныя канструкцыі. Так, у адказ на пытанне: “*Як называецца посуд для цукра*?”, дзіця адказвае: “Гэта ... *такая місачка… з кветачкай. А ручка адломаная. Мама заўсёды ў яе цукар кладзе*”.

Аднак неабходнасць ў аналізе і сінтэзе вытворных слоў выклікана камунікатыўнымі патрэбамі дзіцяці. Таму гэтыя аперацыі паступова пачынаюць ім асвойвацца. Спачатку дзіця засвойвае вытворныя словы з памяншальна-ласкальным значэннем. У значэннях такіх слоў для маленькага дзіцяці заўсёды змяшчаецца “суб’ектыўна-станоўчы кампанент”. Называючы аб’ект рэчаіснасці, які асабліва спадабаўся, дзіця можа стварыць слова з некалькімі рознымі памяншальна-ласкальнымсі суфіксамі (*сабачоначанька, змяюшачка, зайчулянька*). Наступны крок – стварэнне слоў з павелічальным значэннем. Тут дзіця карыстаецца спосабам “адваротнага словаўтварэння”: адбрасвае ад слова марфему, якой насамрэч няма. Так адтрымоўваюцца словы *кабак* (ад *кабачок*), *падуха* (ад *падушка*). Стратэгія “адваротнага словаўтварэння” захоўваецца і далей, у выніку чаго дзіця ўтварае словы тыпу *грыцёнак* (ад *негрыцёнак*), *льга* (ад *нельга*), *лепый* (ад *нелепый*).

Дзіцячая словатворчасць - адна з галоўных асаблівасцей развіцця маўлення дашкольніка. У словатворчасці праяўляецца здольнасць дзяцей ствараць «неалагізмы», такія як, напрыклад, «*атсонілась*», «*бананас*», «*стрыжульня*», «*малювак*». К.І. Чукоўскі вельмі трапна назваў іх “лепыми нелепицами» (у беларускім выражэнні - “глуздыя бязглуздасці”). Дзіцячая словатворчасць - заканамерны шлях авалодання дзіцем марфалагічнымі сродкамі мовы, адно з праяўленняў камбінаторнай здольнасці дзіцяці, якая толькі развіваецца. К. І. Чукоўскі пісаў: «Той, хто ў раннім дзяцінстве на шляху да засваення роднай мовы не ствараў такіх слоў, як «ползук», «вытонуть», «тормозило» і г. д., ніколі не стане поўным гаспадаром сваёй мовы».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даследчыкі выявілі, што першапачатковай функцыяй словатворчасці з'яўляецца намінатыўная, калі дзіця называе сваім словам прынцыпова новы аб'ект. Пазней намінатыўная функцыя адыходзіць на другі план, а на першы выступае функцыя арыенціровачная і экспрэсіўная (эстэтычная). Дзіця пачынае абыгрываць слова, ствараючы па некалькі варыянтаў (*сплім, сплюм, сплям*). Гульня словамі дастаўляе задавальненне. Ствараючы новыя словы, дзіця арыентуецца перш за ўсё на моўную сістэму, на прадуктыўныя словаўтваральныя мадэлі, якія замацаваліся ў яго моўнай свядомасці.

Моўную норму дзіця пакуль што не прымае пад увагу. Таму можна сцвярджаць, што ў працэсе авалодання роднай мовай дзіця спачатку засвойвае сістэму, а ўжо потым – норму (Э. Касерыу). Сістэма мовы мае ў сваім распараджэнні некалькі магчымасцей утварэння слова з патрэбным значэннем. Напрыклад, назоўнік са значэннем дзеяча ўтвараецца ў беларускай мове пры дапамозе розных суфіксаў: - *нік, -ец,* - *ун, -чык – ар* і г.д. Дзіця не можа ведаць, што моўная норма дапускае ўжыванне толькі аднаго назоўніка са значэннем дзеяча ад дзеяслова "*плаваць*" (*плывец*). Яно проста выбірае адну з разнапраўных магчымасцей, што прадастаўляюцца яму моўнай сістэмай, і рэалізуе выбраную магчымасць у сваёй маўленчай дзейнасці. (У маўленні дзяцей можна пачуць наступныя варыянты: *плывун, плаўнік, плавацель,плавальшчык, плавекін, плаўшчык, плаванік* і інш.)

Перыяд актыўнага выкарыстання ўсіх магчымасцей сістэмы пры поўным або амаль поўным ігнараванні нормы з'яўляецца найбольш прадуктыўным і творчым у развіцці маўлення дзіцяці. Менавіта гэтаму перыяду прысвечана знакамітая кніга К.І. Чукоўскага "От двух до пяти", у якой змяшчаецца багацейшы матэрыял па названай праблеме.

Псіхолаг Т.М. Ушакова вылучыла некалькі прынцыпаў, па якіх дзеці ўтвараюць новыя словы:

1) Частка якога-небудзь слова выкарыстоўваецца як цэлае слова: *лепь* (тое, што злеплена), *стрэль* (ад страляць). Гэтыя словы даследчык назвала словамі-асколкамі.

2) Далучэнне да кораня слова "чужога" канчатка: *праўдун* (той, хто гаворыць праўду), *пахнючы, радаванне, страшнасць* і інш.

3) Адно слова складаецца з двух ("сінтэтычныя словы"). Пры стварэнні "сінтэтычных" слоў адбываецца счапленне тых частак слова, якія гучаць падобна: *макрэс = мокры + кампрэс*; *вуліцыянер = вуліца + міліцыянер, калаток = калаціць + малаток, пескаватар = пясок + экскаватар*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

К.І. Чукоўскі, аналізуючы падобныя словаформы ў маўленні дзяцей, адзначаў, што малы "выпраўляе" назву прадмета, імкнучыся падкрэсліць тую адзіную яго функцыю, якую паспеў разгледзіць. "Дзіця неасэнсавана патрабуе, … каб у слове быў жывы, адчувальны вобраз; а калі гэтага няма, дзіця само надае незразумеламу слову пажаданы вобраз і сэнс".

Словатворчасць відавочна дэманструе самастойнасць дзяцей у стварэнні слоў і іх форм. Характэрна, што выкарыстанне прыставак, суфіксаў, канчаткаў у новых словах дзяцей заўсёды строга адпавядае граматычным законам роднай мовы. Павышаная ўвага да значэння і гучання слова праяўляецца і ў так званым «памылковым тлумачэнні» слоў, мноства прыкладаў якога прыводзіць К. І. Чукоўскі. Напрыклад, у слове «*отпугивать*» рускамоўнае дзіця бачыць той жа корань, што ў слове «*пуговица*», «*наблюдением*» лічыць усё, што ляжыць «*на блюде*».

Перыяд словаторчасці цягнецца нядоўга. К пяці-шасці гадам словатворчасць пачынае гаснуць. К.І. Чукоўскі звязваў гэтую з'яву са зніжэннем прыроднай адчувальнасці да мовы, стратай лінгвістынай геніяльнасці. А.М. Гваздзёў адзначаў імкненне дзіцяці гаварыць так, як гавораць дарослыя. Т.М. Ушакова звязвае ўгасанне дзіцячай словатворчасці з тым, што дзіця ўжо даволі трывала засвойвае граматычныя формы і свабодна іх выкарыстоўвае. Як паказваюць даследванні, у звычайных абставінах старэйшыя дашкольнікі пачынаюць саромецца сваіх моўных эксперыментаў. Аднак пры стварэнні спецыяльных гульнявых праблемных сітуацый яны дэманструюць больш высокія магчымасці словатворчасці.

## 3. Пытанні да самакантролю ведаў

*1. Што абазначае тэрмін "марфеміка"?*

*2.Якія часткі слова называюцца марфемамі? Назавіце іх адметныя адзнакі.*

*3. На якія два тыпы падзяляюцца ўсе марфемы?*

*4. Раскажыце пра варыянтнасць марфем. Прывядзіце прыклады.*

*5. Ці могуць марфемы ўступаць у сінанімічныя і антанімічныя адносіны? Прывядзіце прыклад.*

*6. Што выражае аснова слова? Якія бываюць тыпы асноў?*

*7. Якая роля канчаткаў у словах?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*8. Якая частка слова называецца коранем? Чым адрозніваюцца свабодныя і звязаныя карані?*

*9. Якія марфемы называюцца афіксамі?*

*10. Якую ролю ў слове выконваюць прыстаўкі і суфіксы?*

*11. Для чаго служаць словаўтваральныя і формаўтваральныя афіксы? Прывядзіце прыклады.*

*12. Якая марфема называецца постфіксам?*

*13. Чым адрозніваюцца марфемны і словаўтваральны аналіз слова?*

*14.Што разумеюць пад словаўтварэннем? Якая яго роля ва ўзбагачэнні і развіцці лексікі?*

*15. Якая аснова называецца ўтваральнай?*

*16. Што такое словаўтваральны фармант і словаўтваральная вытворнасць?*

*17. Што называецца словаўтваральным ланцужком і словаўтваральным гняздом?*

*18. Якія ёсць асноўныя спосабы словаўтварэння? Чым яны адрозніваюцца паміж сабой?*

*19. Што такое марфалагічнае словаўтварэнне? Якія ёсць разнавіднасці гэтага спосабу ўтварэння слоў?*

*20. Чым характарызуецца марфалагічна-сінтаксічнае словаўтварэнне?*

*21. Што такое складанне як спосаб словаўтварэння? Якія ёсць разнавіднасці складання? Чым яны адрозніваюцца? Падмацуйце прыкладамі.*

*22. Які спосаб утварэння слоў называюць абрэвіяцыяй? Якія ёсць віды абрэвіятур?*

*23. Які спосаб словаўтварэння называюць лексіка-семантычным?*

## 4. Практычныя заданні

**1. Спішыце. Графічна абазначце канчаткі ў словах, пкрэсліце словы без канчатка, вызначце, якой чсацінай мовы яны з’яўляюцца.**

Наіўнае юнацтва! Табе здаецца, што ты выключнае, што ты самае разумнае, мудрае, не падобнае да ўсіх, і жаданні ў цябе недасягальныя. Не адразу да цябе праходзіць разуменне, што “як усе” – гэта не дакор; мудрасць, разумнасць і чалавечая вартасць якраз у тым, каб раўняцца на ўсіх – на людзей, на калектыў, на чалавецтва. Не адразу ты пачынаеш разумець, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характво не ў тваіх незямных марах, не ў тваім імкненні да выключнасці, а ў жыцці людзей і што людзі выпрацавалі самае прыгожае, высакароднае, карыснае, разумнае і ў навуцы, і ў мастацтве, і ў адносінах паміж сабой – у каханніі, у сям'і. З разумення гэтых надзвычай простых ісцін і пачынаецца твая сапраўдная сталасць,юнак.

(І.Шамякін)

**2. Ад прапанаваных слоў утварыце як мага больш новых:**

а) *прыставачным спосабам*:

1) уважлівы –

2) учора–

3) разумнейшы

4) бегчы –

б) *шляхам асноваскладання + суфіксацыі*

1) добрыя суседзі –

2) вострае слова –

3) дзеяць дабро –

4) кароткая шэрсць –

**3. Выпішыце словы, якія складаюцца з пяці марфем. Графічна абазначце гэтыя марфемы.**

Дагледзець, боязна, атлетыка, атаясамліванне, выгароджваць, настойлівасць, мініяцюра, няспешна, паляванне, апусценне, выбрацца, увасьмярых, заручальны, устанаўліваць, паляшучка, спачувальна.

**4. Рознымі спосабамі ўтварыце дзеясловы ад наступных слоў.**

План, каманда, меншы, вялікі, рэпетыцыя, транспарт, рамонт, загад, праўда, трое, ноч, функцыя, апеляцыя, афіша, гарантыя, даклад, госць, светлы, вясёлы, мадэль, рэпрэсія, кантроль, норма, надзея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**5. Падзяліце графічна словы на марфемы і вынаracha, якое слова мае дзве прыстаўкі, корань, чатыры суфіксы і нулявы канчатак?**

Адрэкамендавацца, вынаходніцтва, папавазіўся, бязбоязна, неажыццявімасць, панахадзілася.

**6. Замяніце словазлучэнні адным словам-адпаведнікам.**

Чалавек, які гуляе ў футбол — … , наведвальнік тэатра — … , наведвальнік магазіна — … , наведвальнік бібліятэкі — … , наведвальнік паліклінікі — … , асоба, якая займаецца барацьбой сумо — … , асоба, якая пастаянна карыстаецца паслугамі каго-небудзь або чаго-небудзь — …

**7. Укажыце словы, правільна падзеленыя на марфемы.**

Па-с-па-чу-ва-ць, за-канч-ва-цца, ад-бель-ван-н-ене, на-ў-мыс-н-а, раз-дроб-л-ен-асць, вы-куп-і-л-і, прывыч-к-а, скош-а-н-ы, не-літ-асц-ів-а, учор-а, учара-шн-і, бар-а-ць-б-ітØ.

**8. З дапамогай адпаведных суфіксаў утварыце словы з памяншальна-ласкальным значэннем.**

Агонь — … , песня — … , вагон — … , стол — … , сотня — … , бяроза — … , вішня — …, корань — …, сонца — …, струмень — …, чамадан — … , чарэшня — …

**9. Спішыце і вызначце, якія абрэвіятуры належаць да гукавых?**

ДУМ, БДУ, СНД, ВКЛ, ААН, МУС, СНІД, АТК, МТЗ, НАТО, ЗАГС, БДПУ, ЕШКА, ЦЭЦ.

**10. Адзначце рад(ы), у якіх усе словы з’яўляюцца аднакаранёвымі:**

1) даносчык, паднос, носік;

2) падушка, завушніцы, вушанка;

4) вадаём, вадалаз, падводны;

5) хваля, хваляванне, пахвала.

3) радасць, радасны, узрадаваны;

**11. Размяркуйце ў табліцы словы паводле спосабу іх утварэння.**

Школа-інтэрнат, светла-зялёны, малазнаёмы, вечназялёны, сінявокі, белагрывы, зернясклад, мімаволі, плашч-палатка, плытагон, левабярэжжа, штораз, малаверагодны, часопіс, летапіс, завод-аўтамат, стогалосы, інжынер-канструктар.

| Асноваскладанне | Словаскладанне |
|---|---|
| | |

**12. Запішыце поўныя назвы, адпаведныя абрэвіятурам.**

ААН…………………………………………………………….

НАН……………………………………………………………..

НТР…………………………………………………………...

ЛіМ……………………………………………………………

НДІ…………………………………………………………….

ДАІ…………………………………………………………….

МТЗ……………………………………………………………

ЦУМ……………………………………………………………

ЭВМ…………………………………………………………….

ВНУ……………………………………………………………..

СЭС……………………………………………………………..

РПЦ…………………………………………………………….

РайАНА……………………………………………………………..

Гарсавет……………………………………………………………..

Загс…………………………………………………………………..

Камбат……………………………………………………………….

Гарана………………………………………………………………..

Прафсаюз…………………………………………………………....

Райцэнтр……………………………………………………………..

Лясгас………………………………………………………………..

Санэпідэмстанцыя………………………………………………….

**13. Спішыце і падкрэсліце словы, якія перайшлі ў іншую часціну мовы.**

Марожаная рыба – фісташкавае марожанае, смелы паляўнічы – паляўнічы нож, наступнае выданне – дзверы ў наступнае, з апошнім рублём – дзяліцца апошнім, прыйду ноччу – дыхаю гэтай ноччу, назва ў гары незвычайная – недзе ўгары, стары ўспамінае былое – стары чалавек успамінае былое жыццё, чалавек быў свой – свой не здарадзіць, сталовая талерка – наша сталовая.

**14. Зрабіце марфемны аналіз выдзеленых у тэксце слоў.**

Колькі я сцежак *ператупаў,*
Колькі я *прайшоў* чужых краін,
*Выпрабаваў* слодыч і атруту
*Казачных* і *зменлівых* мясцін, –

Не *прасіла* сэрца, не *папросіць*
Ні раскошы, ні пустых патрэб,
Толькі б на зямлі сваёй *штовосень*
*Славіць* свой *запрацаваны хлеб.*

*Трапіўшы* на іншую планету,
Я і там ад сэрца запяю
На ўсю *шыр* бясконцага *сусвету*

Пра Айчыну светлую сваю.

(Я.Кохан)

**15. Зрабіце словаўтваральны аналіз выдзеленых у тэксце слоў.**

*Поўнач* была *па-зімоваму снежная*, сіне-белая і *па-вясноваму звонкая*, са *шкляным* лядком пад нагамі. Лейцы календара *толькі-толькі перахапіў* сакавік, і ўжо іначай, як дагэтуль, *па-маладому насцярожана* шумеў *бор.* У зацішку хваёва-ядлоўцавага *падлеску*, спінаю *прываліўшыся* да тоўстага дрэва, гледзячы ў *сінь блакіту*, стаяў Іван Данілавіч – высокі, *круглатвары*, з прыгожай, *коратка падстрыжанай***,** *абсыпанай* срэбрам *шасцідзесяцігадовага* веку барадою і такімі самымі срабрыстымі вусамі. *Трапяткая чуйнасць* ночы адпавядала настрою душы, і ў гэтай прыемнай згодзе са светам ён трымаў над галавою *пыжыкавую* шапку, не *зводзячы* вачэй з чорнай *аўтамашыны* пад *ўрадавым* нумарам, якая стаяла за першым ад дарогі шэрагам хвой, *пасаджаных пазалетась вясною.*

(В.Карамазаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ